# ШТОМЕСЯЧНЫ АГЛЯД ЭКАНОМІКІ БЕЛАРУСІ

**№11 (62)**
**Лістапад 2007 г.**

- Расея адмовілася ад будаўніцтва другой галіны газаправоду «Ямал-Эўропа».
- Беларусь і Літва разьвіваюць эканамічную супрацу.
- Урад плянуе пабудаваць у Беларусі завод па вытворчасьці легкавых аўтамабіляў.
- Была зьмененая спрошчаная сыстэма падаткаабкладаньня.
- Вырасьлі золатавалютныя рэзэрвы ВГКР.

**Насельніцтва: 9.71 млн чалавек**
**Прамысловасьць / ВУП: 27.6%**
**Сельская гаспадарка / ВУП: 7.5%**
**Інвестыцыі / ВУП: 24.3%**
**Экспарт: Расія 35%, ЭЗ 46%**
**Імпарт: Расія 59%, ЭЗ 22%**

## Палітыка: адмова Расеі ад будаўніцтва другой галіны газаправоду «Ямал-Эўропа»

У кастрычніку А. Лукашэнка агучыў прапанову аб будаўніцтве другой галіны газаправоду «Ямал-Эўропа». Яго мэтазгоднасьць абгрунтоўвалася найбольш кароткім транспартным плячом пастаўкі расейскага газу ў Эўропу, і, як вынік, нізкімі выдаткамі на яго будаўніцтва і платай за транзіт. Апроч таго, па словах А. Лукашэнкі, пры будаўніцтве першай галіны газаправоду, магутнасьць якога дазваляе ажыцьцяўляць транзіт каля 33 млрд м$^3$ на год, была створаная інфраструктура, якая дазваляе адначасова абслугоўваць і другую галіну гэткай жа магутнасьці. На ягоную думку, гэта дазваляе разглядаць яго будаўніцтва як альтэрнатыву Паўночнаэўрапейскаму газаправоду (ПЭГ) па дне Балтыйскага мора. У выпадку згоды Расеі А. Лукашэка паабяцаў вызваліць расейскіх пастаўшчыкаў газу ад платы за транзіт на пяць год. У пачатку лістапада расейскі ўрад абмеркаваў дадзенае пытаньне на сваім паседжаньні і прыняў рашэньне адмовіцца ад будаўніцтва другой галіны «Ямал-Эўропа», бо ПЭГ дазваляе павялічыць да запланаваных аб’ёмаў пастаўкі расейскага газу ў Эўропу. Такім чынам, пазыцыі Беларусі на перамовах з Расеяй па энэргетычных пытаньнях у будучым яшчэ болей саслабеюць.

## Рэальны сэктар: зьніжэньне ўнёску спажываньня і інвэстыцыяў у прырост ВУП

У трэцім квартале тэмпы росту рэальнага ВУП зьнізіліся да 8.2% г/г (з 8.7% г/г ў другім квартале). Гэта тлумачылася значным запаволеньнем росту асноўных кампанэнтаў сукупнага попыту – спажываньня хатніх гаспадарак і інвэстыцыяў у асноўны капітал. Калі ў першым квартале яны вырасьлі на 16.2 і 29.9% г/г адпаведна, то да трэцяга кварталу тэмпы іх росту зьнізіліся, паводле нашых ацэнак, да 8.7 і 11.9% г/г адпаведна.

Запаволеньне росту спажываньня хатніх гаспадарак абумоўлена заўважным зьніжэньнем тэмпаў росту асноўных крыніцаў даходаў – заробкаў і пэнсіяў. Тэмпы росту заробку зьменшыліся з 17.7% г/г у сярэднім за 2006 г. да 9.6% г/г у 3 кв. 2007 г., а пэнсіі – з 14.3% да 7.0% г/г. Такая дынаміка даходаў характэрная для пэрыяду пасьля прэзідэнцкіх выбараў. Аднак, як правіла, адначасова паскараўся рост інвэстыцыяў, што не адбылося ў гэтым годзе. Такім чынам, энэргетычны шок зрабіў неэфэктыўнымі традыцыйныя інструмэнты кіраваньня інвэстыцыйнай актыўнасьцю прадпрыемстваў.

## Структурныя тэндэнцыі: разьвіцьцё эканамічнай супрацы Беларусі і Літвы

**Міжнародная супраца.** У кастрычніку ў Вільні адбылася неафіцыйная сустрэча прэм'ер-міністраў Беларусі С. Сідорскага і Літвы Г. Кіркіласа. Па выніках сустрэчы С. Сідорскі агучыў гатоўнасьць літоўскага бізнэсу ажыцьцяўляць ін

**Дынаміка рэальнага ВУП**




Крыніца: Міністэрства статыстыкі і аналізу. Прагноз на 2007 г. – Дасьледчы цэнтр ІПМ.

Дасьледчы цэнтр ІПМ

Нямецкая эканамічная група ў Беларусі

220088 г. Мінск, вул. Захарава, 76
Тэл./факс +375 (17) 210 0105
Электронная пошта bmer@research.by
Вэб-сайт http://research.by/

Пераклад на беларускую мову ажыццяўляецца пры падтрымцы часопіса “Новая Эўропа”, http://n-europe.eu/

© Дасьледчы цэнтр ІПМ, 2007

вэстыцыі ў разнастайныя сфэры беларускай эканомікі. Па словах прэмьер-міністра, гаворка ідзе пра суму каля USD 1 млрд. У якасьці канкрэтных інвэстыцыйных праектаў былі названыя будаўніцтва заводу па вытворчасьці фармальдегідных смолаў і стварэньне прадпрыемства па вытворчасьці ДСП. Паводле інфармацыі памочніцы прэмьер-міністра Літвы Н. Пумпрыцкайтэ, на сустрэчы таксама абмяркоўваліся пытаньні супраца ў энэргетычнай сфэры, у прыватнасьці, магчымасьці ўдзелу Беларусі ў будаўніцтве новай АЭС на тэрыторыі Літвы, а таксама паставак праз Беларусь украінскай электраэнэргіі ў Літву пасьля закрыцьця Ігналінскай АЭС. У выпадку рэалізацыі дадзеных праектаў Беларусь зможа зьнізіць сваю энэргетычную залежнасьць ад Расеі і троху зьмякчыць вынікі энэргетычнага шоку ў сярэднетэрміновай пэрспэктыве.

### Вонкавы гандаль: Беларусь зьбіраецца пачаць будаўніцтва заводу легкавых аўтамабіляў

У студзені-жніўні дэфіцыт гандлю таварамі дасягнуў USD 2.4 млрд, што ў 2.2 разы болей, чым на год раней. Экспарт вырас на 16.2% г/г, а імпарт – на 24.2% г/г. Значную частку гандлёвага дэфіцыту па-ранейшаму абумоўлівае гандаль энэргетычнымі таварамі, дэфіцыт па якіх склаў USD 901.1 млн (USD 309.0 млн у студзені-жніўні 2006 г.). Апроч уплыву зьмяненьня коштаў і умоваў паставак расейскіх энэрганосьбітаў, росту энэргетычнага дэфіцыту спрыяе больш хуткі рост цэнаў на сырую нафту, якую імпартуе Беларусь, у параўнаньні з нафтапрадуктамі, якія яна экспартуе. У студзені-жніўні 2007 г. пры павышэньні сусьветных коштаў на сырую нафту на 21.2% г/г, кошты на нафтапрадукты вырасьлі толькі на 4.2% г/г. Для стымуляваньня паставак нафты на беларускія НПЗ, а таксама яе перапрацоўкі, у кастрычніку быў падпісаны ўказ аб павышэньні субсідыяў у сфэры нафтаперапрацоўкі. У адпаведнасьці зь ім, дзяржсубсідыі складуць 130% ад расейскай адмысловай пошліны пры пастаўках нафты на беларускія НПЗ чыгуначным транспартам, і да 110% – пры пастаўках трубаправодным транспартам.

Урад па-ранейшаму разглядае замяненьне імпарту айчыннымі таварамі як адзін з прыярытэтных накірункаў палітыкі ва ўмовах дэфіцыту. У кастрычніку адным з такіх праектаў была названая арганізацыя вытворчасьці легкавых аўтамабіляў у Беларусі. Аднак нават у выпадку яго пасьяховай рэалізацыі гэта ня будзе мець істотнага ўплыву на зьніжэньне адмоўнага сальда, бо дэфіцыт у гандлі спажывецкімі таварамі складае толькі каля 15% ад валавага дэфіцыту.

### Дзяржаўныя фінансы: зьмяненьне спрошчанай сыстэмы падаткаабкладаньня

За студзень-жнівень даходы кансалідаванага бюджэту склалі 43.3% ад ВУП, што на 1.5 адсоткавага пункта вышэй, чым за студзень-жнівень 2006 г. Выдаткі павялічыліся ў параўнаньні з мінулагоднім узроўнем на 0.3 адсоткавага пункта і склалі 40.4% ад ВУП. Такім чынам, кансалідаваны бюджэт быў выкананы з прафіцытам 2.9% ад ВУП (1.6% ад ВУП за студзень-жнівень 2006 г.).

У кастрычніку быў падпісаны ўказ, які зьмяніў спрошчаную сыстэму падаткаабкладаньня. Для прадпрыемстваў, якія працуюць у сфэры розьнічнага гандлю і грамадзкага харчаваньня, уведзеная магчымасьць разьліку спрошчанага падатку ў памеры 20% ад валавага даходу. Раней падаткавай базай была толькі валавая выручка (сума валавага даходу і пакупнога кошту рэалізаваных тавараў), а стаўкі ваґаліся ад 3 да 10%. Скарыстацца новай сыстэмай спро

**ВУП і прамысловая вытворчасьць**




Крыніца: Міністэрства статыстыкі і аналізу.

**Унёсак асноўных кампанэнтаў супольнага попыту ў прырост ВУП**

| | Унёсак у прырост* | | |
|---|---|---|---|
| | 1 кв. | 2 кв. | 3 кв. |
| Спажываньне хатніх гаспадарак | 8.7 | 6.1 | 4.6 |
| Інвэстыцыі ў асноўны капітал | 8.0 | 4.7 | 3.2 |
| Чысты экспарт | -4.0 | 0.8 | -2.0 |
| **ВУП** | **8.2** | **8.7** | **8.4** |

* адсоткавых пунктаў.

Крыніца: разьлікі паводле дадзеных Міністэрства статыстыкі і аналізу. 3 кв. 2007 г. – ацэнка Дасьледчага цэнтру ІПМ.

**Дынаміка вонкавага гандлю таварамі**




Крыніца: Міністэрства статыстыкі і аналізу.

**Тэмпы росту сусьветных цэнаў на нафту і бензін**




Крыніца: US Energy Information Administration.

шчанага падаткаабкладаньня змогуць малыя прадпрыемствы (з колькасьцю супрацоўнікаў ня больш за 5 чалавек) і індывідуальныя прадпрымальнікі з валавай выручкай меней за BYR 600 млн на год. Такім чынам, новая схема спрошчанай сыстэмы падаткаабкладаньня будзе даступная толькі для абмежаванай колькасьці прадпрымальнікаў і прадпрыемстваў, а таму ня будзе мець істотнага ўзьдзеяньня на разьвіцьцё малога і сярэдняга бізнэсу.

## Манетарная палітыка: рост золатавалютных рэзэрваў

У верасьні чыстыя замежныя актывы ВГКР павялічыліся на 13.5% м/м. Пры гэтым іх рост адбываўся пры неспрыяльнай дынаміцы попыту і прапановы на ўнутраным валютным рынку. Рэзэрвы вырасьлі дзякуючы павелічэньню ў верасьні рэшты сродкаў на валютных рахунках ураду ў НББ (на USD 293.3 млн). Верагодна, гэтыя сродкі паступілі ад непразрыстай угоды, зьвязанай з прыватызацыяй ААТ «МЦС» і наступным продажам 70% долі ўласнасьці гэтай кампаніі. У выніку грашовая база за верасень практычна не зьмянілася, а ў гадавым вымярэньні яе рост запаволіўся да 25.4% г/г (31.6% г/г у жніўні).

У выніку падтрыманьня ўзроўню ліквіднасьці ў банкаўскай сыстэме на нізкім узроўні і высокай назьбіранай базай запазычанасьці па крэдытах захавалася тэндэнцыя да зьніжэньня тэмпу росту крэдытаваньня эканомікі – у верасьні ён склаў 48.0% г/г (49.5% г/г у жніўні). Разам з тым, стала высокі попыт на крэдытныя рэсурсы і скарачэньне узроўню ліквіднасьці прывялі да таго, што ў верасьні адсоткавыя стаўкі на крэдытна-дэпазытным рынку па большасьці інструмэнтаў троху вырасьлі. Акрамя таго, захаваўся шэраг тэндэнцыяў на грашовым рынку – адносная стабільнасьць узроўню попыту на наяўныя грошы, запаволеньне росту тэрміновых рублёвых дэпазытаў насельніцтва (28.7 і 26.4% г/г у жніўні і верасьні), а таксама паскарэньне росту тэрміновых дэпазытаў насельніцтва ў замежнай валюце (52.5 і 55.7% г/г у жніўні і верасьні адпаведна). Рублёвая грашовая маса павялічылася ў верасьні на 2.1% м/м, а шырокая грашовая маса – на 2.0% м/м. У гадавым вымярэньні тэмпы іх росту склалі 22.1 і 26.5% г/г адпаведна (23.1 і 25.7% г/г у жніўні).

Спажывецкія цэны ў верасьні вырасьлі на 0.9% м/м у выніку адміністратыўнага павышэньня коштаў на шэраг прадуктаў харчаваньня. У гадавым вымярэньні тэмп росту спажывецкіх коштаў павялічыўся да 9.0% г/г (8.2% г/г у жніўні), што ўжо на 1 адсоткавы пункт вышэй за верхнюю мяжу прагнозу ІПЦ на год. Беларускі рубель у кастрычніку патаньнеў у адносінах да амэрыканскага даляру на 2 рублі, і на 31 кастрычніка яго курс склаў 2151 BYR/USD.

## Банкаўскі сэктар: рост аб’ёму эмісіяў іпатэчных аблігацыяў

Паводле дадзеных Міністэрства фінансаў у першым паўгодзьдзі 2007 г. быў зафіксаваны значны рост аб’ёмаў эмісіі карпаратыўных аблігацыяў. За студзень-чэрвень суб’екты гаспадараньня ажыцьцявілі 29 выпускаў карпаратыўных аблігацыяў. Аб’ём эмісіяў аблігацыяў, намінаваных у беларускіх рублях склаў BYR 215.8 млрд, што ў 2.2 разы перавышае адпаведны аб’ём эмісіяў у першым паўгодзьдзі 2006 г. Апроч таго, быў ажыцьцёўлены выпуск аблігацыяў у замежнай валюце на суму USD 12.5 млн і EUR 7 млн. Практычна ў поўнай меры гэты рост меў месца ў выніку выпуску банкамі аблігацыяў, забясьпечаных выдадзенымі імі крэдытамі на будаўніцтва ці рэканструкцыю жытла пад заклад нерухомасьці (іпатэчнымі аблігацыямі). Доля іпатэчных аблігацыяў у агульным аб’ёме эмісіяў склала амаль

**Кансалідаваны бюджэт**




Крыніца: разлікі па дадзеных Міністэрства статыстыкі і аналізу.

**Грашовая база і ІСЦ**




Крыніца: разлікі па дадзеных НББ і Міністэрства статыстыкі і аналізу.

**Стаўка рэфінансаваньня**




Крыніца: разлікі па дадзеных НББ і Міністэрства статыстыкі і аналізу.

90%. Такім чынам, дазвол банкам эмітаваць іпатэчныя аблігацыі станоўча паўплываў на разьвіцьцё пазыкавага сэгмэнту фінансавага рынку краіны, і даў банкам эфэктыўны інструмэнт доўгатэрміновага рэфінансаваньня.

У кастрычніку НББ скасаваў абмежаваньні на кольнасьць разьліковых рахункаў у беларускіх рублях для ўсіх прадпрыемстваў. Раней такія абмежаваньні былі скасаваныя толькі для невялікага кола буйных прадпрыемстваў, якія атрымалі магчымасьць адкрыцьця дадатковых рахункаў у адным з трох упаўнаважаных банкаў. Дадзены захад троху пашырыць магчымасьці канкурэнцыі за абслугоўваньне буйных прадпрыемстваў і будзе спрыяльным для практыкі абслугоўваньня банкамі разьліковых рахункаў суб’ектаў гаспадараньня.

| **Эканамічныя тэндэнцыі** | | **3 кв. 05** | **4 кв. 05** | **1 кв. 06** | **2 кв. 06** | **3 кв. 06** | **4 кв. 06** | **1 кв. 07** | **2 кв. 07** | **ліп. 07** | **жні. 07** | **вер. 07** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Рост рэальнага ВУП | % г/г | 8.7 | 10.7 | 11.0 | 9.6 | 8.6 | 10.8 | 8.4 | 8.9 | -- | -- | -- |
| Рост рэальнага ВУП | % г/г нар. | 9.0 | 9.4 | 11.0 | 10.3 | 9.6 | 9.9 | 8.4 | 8.6 | 8.8 | 8.5 | 8.4 |
| Рэальная прамысловая вытворчасьць | % г/г нар. | 9.7 | 10.5 | 13.5 | 12.6 | 12.2 | 11.3 | 5.9 | 7.7 | 7.8 | 7.7 | 8.2 |
| Рэальная сельскагаспадарчая вытворчасьць | % г/г нар. | 3.0 | 2.1 | 10.1 | 6.9 | 2.2 | 6.1 | 4.4 | 5.2 | 10.5 | 6.3 | 5.6 |
| ІСЦ | % г/г к/п | 9.8 | 8.0 | 6.8 | 7.0 | 6.4 | 6.6 | 8.1 | 7.2 | 7.2 | 8.2 | 9.0 |
| ІЦВПП | % г/г к/п | 10.5 | 10.2 | 8.3 | 8.1 | 8.0 | 8.5 | 11.6 | 13.6 | 14.6 | 15.8 | 16.8 |
| Экспарт тавараў (USD)* | % г/г | 15.1 | 11.5 | 27.5 | 24.9 | 29.3 | 13.6 | 6.3 | -- | 23.1 | 15.3 | -- |
| Імпарт тавараў (USD)* | % г/г | 7.8 | -5.3 | 51.3 | 37.0 | 30.0 | 23.5 | 21.1 | -- | 32.1 | 26.1 | -- |
| Сальда гандлю таварамі (дадзеныя НББ) | USD млн. нар. | 43 | -527 | -136 | -786 | -1215 | -2398 | –836 | -1563 | -1785 | -2073 | -- |
| Бягучы рахунак | USD млн нар. | 816 | 510 | 115 | -289 | -558 | -1512 | –641 | -1152 | -- | -- | -- |
| Бягучы рахунак | % ВУП нар. | 3.7 | 1.7 | 1.5 | -1.8 | -2.1 | -4.1 | –7.0 | -5.8 | -- | -- | -- |
| Міжнародныя рэзервы | USD млн к/п | 1189 | 1297 | 1290 | 1154 | 1155 | 1383 | 1565 | 2344 | 2362 | 1837 | 2155 |
| Грашовая база | % г/г к/п | 50 | 74 | 53 | 48 | 38 | 20 | 22 | 29 | 32 | 32 | 25 |
| Стаўка па крэдытах у беларускіх рублях** | % гадавых, к/п | 14 | 12 | 12 | 11 | 12 | 12 | 13 | 12 | 12 | 12 | 12 |
| Абменны курс (афіцыйны) | BYR/USD с/п | 2150 | 2150 | 2151 | 2146 | 2142 | 2141 | 2141 | 2145 | 2145 | 2146 | 2148 |
| Абменны курс (афіцыйны) | BYR/EUR с/п | 2623 | 2558 | 2587 | 2694 | 2729 | 2761 | 2805 | 2890 | 2941 | 2923 | 2979 |

* тэмпы росту даляравых паказнікаў (крыніца: разлікі па дадзеных Міністэрства статыстыкі і аналізу).
** намінальная стаўка па новых крэдытах юрыдычным асобам (крыніца: НББ).
Крыніцы: Міністэрства статыстыкі і аналізу і НББ.

| **Асноўныя эканамічныя паказнікі** | | **2000** | **2001** | **2002** | **2003** | **2004** | **2005** | **2006** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Намінальны ВУП | BYR трлн | 9.134 | 17.173 | 26.613 | 36.565 | 49.991 | 65.067 | 79231 |
| Намінальны ВУП* | USD млрд | 8.7 | 12.1 | 14.5 | 17.7 | 23.1 | 30.2 | 36.9 |
| Рост рэальнага ВУП | % г/г | 5.8 | 4.7 | 5.0 | 7.0 | 11.4 | 9.4 | 9.9 |
| Прамысловая вытворчасьць | % г/г | 7.8 | 5.9 | 4.5 | 7.1 | 15.9 | 10.5 | 11.3 |
| Сельскагаспадарчая вытворчасьць | % г/г | 9.3 | 1.8 | 0.7 | 6.6 | 12.6 | 1.7 | 6.1 |
| ІСЦ | % г/г с/п | 168.6 | 61.1 | 42.6 | 28.4 | 18.1 | 10.3 | 7.0 |
| ІСЦ | % г/г к/п | 107.5 | 46.1 | 34.8 | 25.4 | 14.4 | 8.0 | 6.6 |
| ІЦВПП | % г/г с/п | 185.3 | 72.1 | 41.4 | 37.5 | 24.1 | 12.1 | 8.3 |
| ІЦВПП | % г/г к/п | 166.4 | 40.9 | 42.7 | 28.1 | 18.8 | 10.0 | 8.5 |
| Экспарт (т/п, USD) | % г/г | 19.4 | 10.9 | 9.8 | 24.4 | 35.7 | 15.8 | 21.8 |
| Імпарт (т/п, USD) | % г/г | 21.5 | 11.1 | 9.0 | 25.1 | 40.3 | 3.0 | 33.0 |
| Бягучы рахунак | USD млн | -338 | -394 | -311 | -424 | -1206 | 510 | -1512 |
| Бягучы рахунак | % ВУП | -3.9 | -3.2 | -2.1 | -2.4 | -5.2 | 1.7 | -4.1 |
| ПЗІ (чыстыя) | USD млн | 119 | 96 | 453 | 170 | 163 | 303 | 351 |
| Міжнародныя рэзервы | USD млн | 357 | 347 | 457 | 474 | 770 | 1297 | 1383 |
| Сальда дзяржбюджэту | % ВУП | -0.6 | -1.6 | -0.2 | -1.6 | 0.0 | -0.6 | 2.2 |
| Унутраны дзяржаўны доўг | % ВУП к/п | 4.5 | 6.1 | 5.4 | 5.5 | 5.7 | 5.8 | 6.5 |
| Знешні доўг (суцэльны) | % ВУП к/п | 24.4 | 24.8 | 27.0 | 23.7 | 21.4 | 17.9 | 18.6 |
| Грашовая база | % г/г к/п | 52 | 225 | 32 | 50 | 42 | 74 | 20 |
| Абменны курс (НББ) | BYR/USD с/п | 1035 | 1394 | 1784 | 2075 | 2160 | 2154 | 2145 |
| Абменны курс (НББ) | BYR/USD к/п | 1213 | 1580 | 1920 | 2156 | 2170 | 2152 | 2140 |
| Спрэд** | % с/п | 44.4 | 0.8 | 0.0 | 0.0 | 0.0 | 0.0 | 0.0 |
| Спрэд** | % к/п | 2.8 | 0.2 | 0.0 | 0.0 | 0.0 | 0.0 | 0.0 |
| Абменны курс (НББ) | BYR/EUR с/п | 651 | 1239 | 1690 | 2353 | 2684 | 2681 | 2692 |
| Абменны курс (НББ) | BYR/EUR к/п | 1097 | 1392 | 1989 | 2695 | 2956 | 2550 | 2817 |

* ВУП у даляравым эквіваленьце за 2000 гг. разлічаны па рынкавым (неафіцыйным) валютным курсе (крыніца: Дасьледчы цэнтр ІПМ).
** спрэд паміж безнаяўным курсам ценявога рынку і афіцыйным курсам (крыніца: Дасьледчы цэнтр ІПМ).
Крыніцы: Міністэрства статыстыкі і аналізу, Міністэрства фінансаў, НББ, Дасьледчы цэнтр ІПМ.

**Умоўныя азначэнні:**

| | | | |
|---|---|---|---|
| г/г | змены год да году | нар. | нарастаючым вынікам |
| ІСЦ | індэкс спажывецкіх цэнаў | НББ | Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь |
| ІЦВПП | індэкс цэнаў вытворцаў прамысловай прадукцыі | ПЗІ | простыя замежныя інвестыцыі |
| к/п | на канец перыяду | с/п | сярэдняе за перыяд |
| м/м | змены за месяц | трлн | трыльён |
| млн | мільён | ЭЗ | Эўрапейскі Зьвяз |
| млрд | мільярд | | |